ЛИТЕРАТУРА

1. Победа советской власти в Белоруссии. – Минск: Наука и техника, 1967. – 508 с.

2. Башко П. К. Советы рабочих, солдатских и крестьянских депутатов Белоруссии (март – октябрь 1917 г.) / Под ред. И. М. Игнатенко. – Минск: Наука и техника, 1987. – 254 с.

3. Нестеренко Е. И., Осмоловский В. П. Советы Белоруссии, окт. 1917 – янв. 1919 г. / Под ред. И. М. Игнатенко. – Минск: Наука и техника, 1989. – 232 с.

УДК 947.6. «1917»

І.М. Рыжанкоў, дац., канд. гіст. навук
(БДТУ, г. Мінск)

# СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ПАДЗЕЯХ ЛЮТАГА 1917 Г.

Сялянства Беларусі, як і ўсёй Расійскай дзяржавы, прыняла на веру запэўніванні Часовага ўрада ў абавязковым ажыццяўленні аграрнай рэформы пасля пераможнага заканчэння вайны і склікання Устаноўчага сходу. Уся далейшая ўрадавая палітыка ў аграрным пытанні ў цэлым спрыяла задавальненню патрэб сялянства ў арандаванні пуставаўшай зямлі. На тое ж была скіравана дзейнасць мясцовых уладных структур – камісарыятаў, а ў далейшым – зямельных камітэтаў.

Разам з тым новаўвядзенні ў парадак землеўладання і землекарыстання (яго пастановы аб перадачы ў распараджэнне Міністэрства земляробства удзельных і кабінецкіх зямель, аб «Аб ахове пасеваў», аб скасаванні землеўладкавальных камісій, «Правілы аб ахове лясоў і іх рубкі» і інш.), а таксама перадача звязаных з імі пытанняў у веданне адмысловых органаў, выклікала прыкметную актывізацыю гаспадарчай ініцыятывы сялянства, што адпавядала іх карпаратыўным, а таксама дзяржаўным і грамадскім інтарэсам.

У маі-пачатку чэрвеня пасля Усерасійскага, губернскіх і павятовых сялянскіх з’ездаў, якія выказаліся за скасаванне заключаных пасля 1 сакавіка арэндных здзелак і перадачу ўсіх зямель у распараджэнне зямельным камітэтам, на Беларусі распаўсюдзіліся і набылі масавы характар парубкі лесу, пасьба жывёлы ў лясных урочышчах, захопы панскіх і заарэндаваных сенакосаў і інш. Гэтыя праявы гаспадарчай дзейнасці сялянскіх грамадстваў, нягледзячы на наяўнасць адпаведных пастаноў валасных, харчовых і зямельных камітэтаў, кваліфікаваліся ўрадавымі органамі як «аграрныя парушэнні». У ліку прычын, якія іх (парушэнні) умацнялі варта

назваць, па-першае, неразвітая прававая свядомасць сялян, якія выкарыстоўвалі пэўныя пункты рэзалюцый сваіх з’ездаў на сваю карысць; па-другое, непаслядоўная, паспешлівая дзейнасць губернскіх і павятовых зямельных камітэтаў на чале з эсэрамі; па-трэцяе, карыслівая ў адносінах памешчыцкай і інш. маёмасці дзейнасць валасных (выканаўчых, харчовых, зямельных), па сацыяльнаму складу амаль суцэльна сялянскіх камітэтаў; па-чацвертае, ва ўмовах аслаблення рэпрэсіўнага апарату ўлады, фактычнага перапынення ідэалагічнага, грамадзянска-патрыятычнага ўздзеяння ў сялянскім асяроддзі на фоне распачатай падрыхтоўкі да аграрнай рэформы адносна памешчыцкай, царкоўнай, дзяржаўнай і інш. маёмасці на першы план сталі выходзіць абшчынныя і індывідуальныя інтарэсы; па-пятае, аграрныя парушэнні сялян верасня-кастрычніка 1917 г. не звязваліся з палітычнымі патрабаваннямі, не насілі антыўрадавага характару, а былі выкліканы, галоўным чынам, агульным пагаршэннем эканамічнага становішча ў краіне. Настрой сялян на ажыццяўленне аграрнай рэформы законным, а не захопным шляхам, істотна пераважаў на вёсцы, аб чым, у прыватнасці, красамоўна сведчыў іх удзел у выбарах Устаноўчага схода, а затым і органаў новай, Савецкай улады.

Намаганні Часовага ўрада па збору ахвяраванняў на Беларусі на карысць фронта знайшлі значную падтрымку сярод насельніцтва, асабліва сялянства. У рэалізацыі збору сродкаў на карысць арміі і ў фонд абароны арміі на вёсцы ўладныя органы выкарыстоўвалі пэўны вопыт самадзяржаўя. Пасля рэвалюцыі па меры дэмакратызацыі грамадства такая работа набывала палітызаваную афарбоўку, але гэтая акалічнасць у цэлым амаль не адбілася на настроях сялянства, якое яшчэ з пачатку вайны ўсвядоміла неабходнасць дапамогі сваёй арміі.

Нягледзячы на велізарную прапагандысцкую і арганізацыйную работу Часовага ўрада па прыцягненні сялян да дзяржаўных спраў, камітэты розных узроўняў з іх удзелам не здолелі забяспечыць рэалізацыі абвешчанай манаполіі на ўраджай 1917 г.

Гэта акцыя правалілася, але не з-за палітычных настрояў сялянства, а з-за ўзнікшай неадпаведнасці яго гаспадарча-эканамічных інтарэсаў патрэбам дзяржавы і астатняга грамадства. На зрыў хлебнай манаполіі і пагаршэнне забеспячэння арміі і горада сялянскімі прадуктамі істотным чынам паўплываў заняпад наступальніцкіх настрояў на фронце, а разам з ёй і патрыятычнага ўздзеяння на сялянства. Мала таго, па той жа прычыне знізіліся і паступленні ахвяраванняў з вёскі.

У выніку нават для законапаслухмяных беларускіх сялян хлебная манаполія, па сутнасці, перастала быць абавязковай да выканання. Выкліканае, акрамя іншых фактараў, такімі іх паводзінамі абвастрэнне

харчовага пытання істотна падрывала аўтарытэт Часовага ўрада, узмацняла сацыяльную напружанасць у беларускіх гарадах, на Паўночным і Заходнім фронтах і тым стварала глебу для чарговай рэвалюцыі.

Невыпадкова, што франтавікі, якія засталіся без прадуктаў, ужо пасля звяржэння Часовага ўрада, былі вымушаны шукаць іх у панскіх і нават хутарскіх гаспадарках. У выніку органам Савецкай улады давялося займацца вырашэннем харчовай праблемы ў яшчэ больш складаных умовах

УДК 331.556.4(476=430)«1918/1939»

В.У. Коваль, дац., канд. гіст. навук
(БГТУ, г. Минск)

## ХАРАКТАРЫСТЫКА АСНОЎНЫХ КІРУНКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ЭМІГРАЦЫІ Ў ГЕРМАНІІ (1918–1939 гг.)

Германія ў міжваенны перыяд стала адным з палітычных і эканамічных цэнтраў беларускай эміграцыі, куды перасяляліся жыхары Заходняй Беларусі, якая з 1921 г. па 1939 г. уваходзіла ў склад Польшчы. Даследаванне беларускай міжваеннай дыяспары ў Германіі толькі пачынаецца, шмат якія аспекты засталіся пакуль па-за ўвагай гістарычнай супольнасці. Даследчыкі вывучаюць дзейнасць палітычных эмігрантаў у Берліне, абыходзячы эканамічныя працэсы.

У пачатку 1920-х гадоў на палітычнай арэне актыўна праявілі сябе прадстаўнікі дыпламатычнай місіі БНР, аднак пасля правядзення ІІ Усебеларускай канферэнцыі ў Берліне ў 1925 г. дзейнасць палітычных арганізацый у Германіі пайшла на спад. Большасць палітычных дзеячоў з ліку беларусаў пражывалі ў Берліне, некаторыя жылі ў Гамбургу, які стаў значным портам для беларусаў замежжа.

Беларускія эмігранты ў Германіі спрабавалі выступіць у ролі кансалідуючага цэнтра нацыянальнай дыяспары, аднак іх імкненне не было рэалізавана. З мэтай аб’яднання арганізацый замежжа ў 1932 г. у Берліне пачалі выдаваць беларускамоўную газету “Барацьба”. Рэдакцыя перыядычнага выдання мела шырокія кантакты з беларусамі ў розных краінах свету, таму на старонках газеты размяшчалася інфармацыя пра дзейнасць беларусаў у Францыі, Чэхаславакіі і нават Бразіліі.

Першы нумар “Барацьбы” пачынаецца артыкулам “Ад рэдакцыі”, дзе дакладна прагучала мэта беларускамоўнай газеты ў Берліне: “Нацыянальна-вызваленчая легальная прэса ўжо на працягу некалькіх гадоў здушана да шчэнту. ... балюча адчувае і беларуская эміграцыя ў